УДК 94 (476) «1928/1939»

***А.П. Дзмітрук***

*паслушніца жаночага манастыра Нараджэння Багародзіцы г. Брэста*

e-mail: dep@tut.by

# ПРАЕКТЫ ПАРТЫЙ УРАДАВАЙ АРЫЕНТАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ГРАМАДСКА-ГАСПАДАРЧАЙ ПРАЦЫ Ў ВІЛЕНСКІМ І НАВАГРУДСКІМ ВАЯВОДСТВАХ (1928–1939 гг.)

*Праекты партый урадавай арыентацыі ў сферы грамадска-гаспадарчай працы з'яўляюцца важнымі крыніцамі, якія дазваляюць зразумець мэты дзейнасці польскага ўрада на заходнебеларускіх землях, акрэсліць функцыі, замацаваныя за дадзенымі арганізацыямі ў руху пілсудчыкаў, даказаць пераемнасць і непарыўнасць у дзейнасці абедзвюх палітычных груповак, вылучыць створаную польскімі ўладамі арганізацыйна-прававую канструкцыю кіравання краем.*

## Уводзіны

Пачатак распрацоўкі партыямі праектаў па арганізацыі грамадска-гаспадарчай працы ўрада ў рэгіёнах быў пакладзены на агульнапольскім з'ездзе ў Варшаве ў 1933 г. [1; 2]. Яго вынікі і вынікі рэгіянальных з'ездаў былі апублікаваны Беспартыйным блокам супрацоўніцтва з урадам маршала Ю. Пілсудскага (ББСУ) пад назвай «З'езд дзеячаў грамадска-гаспадарчых гарадоў ваяводства…». На заходнебеларускіх землях з'езды прайшлі ў Палескім ваяводстве двойчы [3; 4], а дзеячы Віленскага і Навагрудскага паветаў правялі адзін аб'яднаны з'езд [5]. Другая групоўка – Лагер нацыянальнага аб'яднання (ЛНА) – выпрацавала некалькі дакументаў, якія сталі лагічным працягам папярэдніх, напрыклад, «Нарысы праекта ўдасканалення арганізацыі формаў працы над павышэннем узроўню палескага сельскагаспадарчага насельніцтва» [6, с. 1–6]. Віленска-Навагрудскі аддзел апублікаваў «Праект рэформы сельскагаспадарчага самакіравання» [7] і «Пробны нарыс мінімальнай праграмы ў беларускай справе» [8].

У дадзеным артыкуле сканцэнтруемся на праектах, якія былі распрацаваны ў Віленска-Навагрудскай акрузе, каб прадэманстраваць іх пераемнасць; асноўная ўвага надаецца аналізу зместу праектаў па арганізацыі грамадска-гаспадарчай працы ўрада з мэтай вылучэння на іх аснове плана кіравання краем, які забяспечваў дамінаванне палякаў у вызначанай сферы.

Ваяводская рада ББСУ ў Вільні сабрала ўдзельнікаў грамадска-гаспадарчага з'езда 8 верасня 1933 г. На пленарным пасяджэнні былі прачытаны два даклады: «Развіццё сельскай гаспадаркі як аснова гаспадарчага развіцця Віленшчыны і ўсходніх зямель» былога міністра сельскай гаспадаркі і зямельных рэформ і рэктара Віленскага ўніверсітэта В. Станевіча і «Праблемы рамяства і гандлю Віленшчыны» дырэктара Прамыслова-гандлёвай палаты В. Бараньскага. Далейшая праца з'езда праходзіла ў камісіях (сельскагаспадарчай, прамыслова-гандлёвай, самакіравання, працы) і секцыях [5]. Там ішло абмеркаванне гаспадарчых праблем; грамадскія пытанні ў асноўным былі асветлены на пленарным пасяджэнні.

Прабуджэнне энергіі і творчай ініцыятывы грамадства ў прамове В. Станевіча прагучала ў якасці непасрэднай мэты з'езда, якую ён прапаноўваў вырашаць праз ажыўленне і ўдасканаленне гаспадарчага жыцця Віленшчыны і ўсходніх зямель. А выкананне гэтага ў сельскагаспадарчым краі, на погляд рэктара Віленскага ўніверсітэта, звязана з павышэннем адукацыйнага ўзроўню сельскага насельніцтва, аднаўленнем дабрабыту вёскі, таму менавіта гэтая тэма стала галоўнай задачай, у вырашэнні якой былі зацікаўлены ўсе як на вёсцы, так і ў горадзе.

У няўдачах гаспадарчай палітыкі дзяржавы В. Станевіч абвінаваціў «сельскагаспадарчае грамадства, якое неарганізавана, разбіта і не можа змагацца за свае правы,

не ўмее карыстацца здабытымі ўрадам дасягненнямі». Аднак, з іншага боку, калі, нягледзячы на ўбогасць глебы, суровы клімат, фатальныя геапалітычныя ўмовы, нават крызіс, сельская гаспадарка на «ўсходніх землях» развівалася, то, на думку В. Станевіча, гэта заслуга чалавечага фактара, які «рэпрэзентуе вялікія каштоўнасці інтэлекту і характару» ва ўсіх слаях грамадства. І з дапамогай такой сельскагаспадарчай арміі, на яго погляд, можна змагацца і перамагаць, але і яе трэба арганізаваць. Цвёрдыя асновы для гэтага павінна было стварыць сельскагаспадарчае самакіраванне, якое абапіралася на добраахвотныя арганізацыі. Яно павінна стаць генеральным штабам, задачай якога было выпрацоўваць стратэгічныя планы, выбіраць тактыку, знаходзіць лідараў, якія б мелі аўтарытэт і магчымасць вывесці сельскую гаспадарку да барацьбы за лепшую будучыню. Праблема як «сельскагаспадарчага грамадства», так і «сельскагаспадарчай арміі» адна – іх неарганізаванасць, «няўменне сумесна і згодна працаваць». Таму адраджэнне сельскай гаспадаркі Віленшчыны трэба пачынаць з ліквідацыі гэтых недахопаў [5, с. 12–13].

З такімі палажэннямі згаджаўся дырэктар Прамыслова-гандлёвай палаты В. Бараньскі. Арганізоўваючы армію гаспадарчых дзеячаў, – пераканаць Бараньскі, – трэба падумаць аб штабе. Нярэдка самастойныя кіраўнікі (сельскагаспадарчы, прамысловы, рамесны, некаторыя іншыя) глядзяць на агульныя гаспадарчыя праблемы праз прызму свайго эгаізму, інтарэсаў, устаноў. «Для дасягнення нашых мэт поўнасцю гарманізаваць акцыю з дзейнасцю элемента, які выконвае ўрадавую палітыку». В. Бараньскі прапаноўваў аб'яднаць усе сферы гаспадарчых дзеячаў, якія працуюць на дзяржаўнай службе, ажывіць адным духам і праграмай гаспадарчае грамадства і гаспадарчы ўрадавы апарат і самакіраванне [5, с. 12–13].

У адрозненне ад Палескага ваяводства ў рабоце з'езда грамадскія справы выразна стаялі на другім месцы. Яны складалі нязначны эпізод, а вось пытанні рацыянальнай арганізацыі рэгіянальнай гаспадаркі сталі асноўнымі. Віленская арганізацыя ББСУ выразна сканцэнтравалася не столькі на арганізацыйных формах, але на змесце і якасці прац. Справамі фарміравання сельскагаспадарчай арміі – арганізацыі мас, выпрацоўкі стратэгічных планаў, тактыкі, знаходжання лідараў – павінна было займацца сельскагаспадарчае самакіраванне, якое абапіралася на добраахвотныя арганізацыі, як на іншых тэрыторыях Польшчы. Стварэнне кіраўнічага адзінага штабу, выпрацоўка ім адзінай праграмы – вось на што была накіравана асноўная ўвага Віленскай рады ББСУ. Яе праект адпаведна больш шырокі па ахопе спраў, цэласны, навукова абгрунтаваны, чым у Палескай рады ББСУ.

Пасля роспуску ў 1935 г. ББСУ ўрадавы лагер у лютым 1937 г. стварыў новую палітычную арганізацыю – Лагер нацыянальнага аб'яднання (ЛНА). У 1937 г. Бюро даследаванняў ЛНА Віленскай і Навагрудскай акругі выступіла з «Праектам рэформы сельскагаспадарчага самакіравання» [7]. Першае, на што трэба звянуць увагу ў праекце, – гэта разыходжанні ў тэрыторыі, на якую павінна была распаўсюджвацца дадзеная рэформа: калі на вокладцы Праекта напісана «паўночна-ўсходнія землі», то ў тэксце – для «зямель былога Вялікага Княства Літоўскага» [7, с. 1–3].

У якасці асноўнай дзяржаўнай праблемы ўрад вызначыў «агітацыю народных мас для Польшчы, працу з пасіўнымі і негатыўна настроенымі элементамі з мэтай выхавання актыўных польскіх грамадзян». У краі, дзе больш за 80 % насельніцтва жывуць з працы ў сельскай гаспадарцы, гэтая справа звязана з праблемай удасканалення сельскай гаспадаркі і пашырэння эфектыўнай апекі над сельскагаспадарчым вытворцам. На дадзеным этапе ставілася задача павышэння культурна-гаспадарчага ўзроўню сельскага насельніцтва і моцная сувязь яго з польскай дзяржаўнасцю. Як прапаноўвалі вырашаць яе дзеячы Віленска-Навагрудскай акругі? Фактычна ў рэчышчы сваёй папярэдніцы, але з абгрунтоўваннем сваёй пазіцыі. Адзначалася, што сялянскія масы немагчы-

ма выхаваць без вывядзення іх са стану галечы, без павышэння жыццёвага ўзроўню. «Кожны, хто ведае сітуацыю на паўночна-ўсходніх землях, не сумняваецца, што мясцовы селянін не стане грамадзянінам і не зменіць сваіх адносін да дзяржавы, пакуль яго жыццёвы ўзровень будзе знаходзіцца на ўзроўні галечы» [7, с. 5]. Імкненне да сацыялізацыі селяніна без адначасовага павышэння яго жыццёвага ўзроўню – гэта сізіфава праца. Адсюль прыйшлі да высновы, што трэба пачаць з паляпшэння быту народных мас як першачарговай задачы. «Сацыялізацыя павінна прыйсці сама, калі адбудзецца павышэнне ўзроўню асветы і палепшацца ўмовы існавання грамадзян. Але немагчыма з гэтага пачынаць. Гэта павінна стаць вынікам апекі, якую трэба распаўсюдзіць над земляробамі, але нельга рабіць яе пунктам выхаду» [7, с. 12]. Кіраўнікі Віленска-Навагрудскай акругі партыі лічылі: «Калі будзем мець за сабой рэальныя гаспадарчыя і культурныя дасягненні, тады ідэі і задачы лагера найлепш будуць зразумелымі для шырокіх мас, і насельніцтва само будзе схіляцца да ЛНА» [7, с. 3]. Таму прапаноўвалі адкласці на другі план арганізацыйныя амбіцыі, а асноўную ўвагу надаць зместу і якасці прац, у якіх разглядаць выключна карысць для насельніцтва, яго дабрабыт і прагрэс.

Паўстала пытанне, хто можа выканаць гэтую працу найбольш эфектыўна. У выніку прыйшлі да высновы, што такую працу павінен выконваць грамадскі элемент, мясцовы, але абсталяваны атрыбутамі публічна-прававой і прымусовай арганізацыі – развітае сельскагаспадарчае самакіраванне, якое ахоплівала сваёй дзейнасцю ўсіх сельскіх жыхароў, магло эфектыўна працаваць над паляпшэннем прадукцыі і павышэннем даходнасці гаспадарак. Тым больш, што згодна з арт. 8 распараджэння прэзідэнта Польшчы ад 22 сакавіка 1928 г. мэтамі яго дзейнасці былі: 1) прадстаўніцтва і абарона інтарэсаў сельскай гаспадаркі; 2) самастойныя дзеянні з мэтай падтрымкі сельскай гаспадаркі; 3) выкананне заканадаўства і супрацоўніцтва з уладамі.

Але, на погляд кіраўнікоў акруговай ЛНА, закон, вызначыўшы мэту, не надаў ім органаў, з дапамогай якіх яны маглі б дасягнуць яе. Адзінай яго формай з'яўляліся сельскагаспадарчыя палаты, якія не мелі падпарадкаваных органаў ў меншых тэрытарыяльных адзінках. Згодна з заканадаўствам палаты павінны былі абапірацца на тэрытарыяльнае самакіраванне і добраахвотныя сельскагаспадарчыя арганізацыі. Але гэтыя ўстановы, па перакананні кіраўнікоў ЛНА, не маглі быць прызнаны ў якасці органаў сельскагаспадарчых палат. Павятовая сельскагаспадарчая камісія ўхваліла толькі падзел сродкаў на сельскагаспадарчыя мэты, а гмінныя сельскагаспадарчыя камісіі займаліся статыстыкай і тэарэтычна ўдзельнічалі ў фарміраванні бюджэту. А найважнейшыя задачы: прадстаўніцтва інтарэсаў сельскіх жыхароў і ініцыятыва ў сферы паляпшэння вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі і жывёлагадоўлі – не належалі да сферы іх дзейнасці. Вылучалася сама камісія праз павятовы аддзел, які не з'яўляўся элементам грамадскага самакіравання. Адсюль дамінаванне ў камісіі бюракратычнага элементу і яе старшыні – старасты.

У сваю чаргу, добраахвотныя арганізацыі мэтай свайго існавання лічылі працу над паляпшэннем сельскай гаспадаркі, але слабым бокам іх дзейнасці была адсутнасць такіх рыс, як прымусовасць і ўніверсальнасць. Акрамя таго, параўноўваючы колькасць асоб, якія належалі да сельскагаспадарчых гуртоў, з лічбай самастойных гаспадарак у дадзеных ваяводствах, аўтары прыйшлі да высновы, што іх вельмі мала (сельскагаспадарчыя гурты аб'ядноўвалі ледзьве 1,2 % гаспадарак) [7, с. 10]. Такім чынам, паўставала пытанне, ці могуць яны дзейнічаць ад імя ўсіх земляробаў? Фактычна яны прадстаўлялі толькі сваіх членаў. Усё гэта парушала ідэю, закладзеную ў аснову пабудовы сельскагаспадарчага самакіравання.

Акрамя гэтага, нараканні з боку прадстаўнікоў Віленска-Навагрудскай акругі выклікаў асабовы склад сельскагаспадарчых палат. Радцы падзяляліся на дзве групы – прызначаныя і выбарныя; выбраныя дзяліліся на выбарных ад акруг і дэлегатаў акру-

говых таварystваў сельскагаспадарчых арганізацый і гуртоў. І фактычна толькі радцы, выбарныя ад акруг, маглі лічыцца прадстаўнікамі сельскага насельніцтва, таму што добраахвотныя арганізацыі прадстаўлялі не шырокія слаі, а толькі элітарныя групы. Такім чынам, сельскагаспадарчае самакіраванне не было здольна выконваць свае задачы на «ўсходніх землях» [7, с. 14]. Зыходзячы з гэтага былі вызначаны мэты рэформы: 1) ахоп дзейнасцю ўсіх сялян праз наданне сельскагаспадарчаму самакіраванню рысаў прымусовасці; 2) стварэнне ў гмінах і паветах адпаведных органаў, якія б узяліся за рэалізацыю задачы гаспадарчага самакіравання; 3) рэфармаванне саміх палат.

Першым ідэю рэформы выказаў генерал Л. Жэлігоўскі, ён жа і распачаў яе на тэрыторыі Віленска-Трокскага павета [9]. Эксперыментальна на падставе дзеючых нормаў былі створаны камісіі гміннай рады, якія складаліся з дэлегатаў ад кожнай грамады (па адным), выбраных большасцю галасоў. Старшынёй мог быць войт або яго намеснік, або члены камісіі самі выбіралі старшыню з свайго склада. У якасці задач гэтых камісій выступалі: 1) планаванне дзейнасці гміны па падтрымцы развіцця сельскай гаспадаркі; 2) складанне каштарысу выдаткаў на сельскагаспадарчыя мэты і накіраванне гміннай радзе комплексных гаспадарчых прапаноў; 3) супрацоўніцтва з гмінным праўленнем пры выкананні бюджэту і плана працы сельскагаспадарчага аддзела [7, с. 18].

З 1 студзеня 1938 г. у рамках тэрытарыяльнага гміннага самакіравання было прадугледжана стварэнне ў кожнай гміне пасады сельскагаспадарчага інструктара, якім павінен быў стаць аграном. Ён ажыццяўляў функцыі сакратара гміннай сельскагаспадарчай камісіі і з'яўляўся яе выканаўчым органам. Арганізацыйна інструктар залежаў ад праўлення гміны, якое яго прызначала і звальняла, а прафесійна – ад павятовага агранома [9; 10]. Дзейнасць сельскагаспадарчага інструктара як формы самакіравання мела прымусовы характар і ахоплівала ўсіх сельскіх жыхароў. Адначасова на павятовым узроўні была створана асобная сельскагаспадарчая камісія з 15 выбраных членаў (па адным ад кожнай гміннай [7]). Яе задачамі сталі распрацоўка павятовага сельскагаспадарчага бюджэту, распрацоўка планаў працы ў павеце. Асобнага выканаўчага органа павятовай камісіі не прадугледжвалася, бо яна павінна была цесна супрацоўнічаць з павятовым аграномам [7, с. 20].

Наступная стадыя рэалізацыі праектаў урада па арганізацыі грамадска-гаспадарчай працы патрабавала ўнясення змен у заканадаўства. На ўзроўні гмін прапаноўвалася папраўка аб наданні рэформе прымусовага характару, аб абавязковым стварэнні сельскагаспадарчых камісій ва ўсіх гмінах. На погляд аўтараў праекта, структура і склад камісій павінны былі заставацца такія ж, але замест дэлегатаў ад добраахвотных сельскагаспадарчых арганізацый іх членаў павінны былі выбіраць ад грамады – па адным ад кожнай, за выключэннем солтысаў і падсолтысаў. Акрамя гэтага, патрабавалася надаць камісіям права рашаючага голасу. Аўтары рэкамендавалі абавязкова ўвесці ў кожнай гміне пасаду сельскагаспадарчага інструктара з дакладным акрэсленнем яго абавязкаў і прынцыпаў адносін камісіі з гміннай радай і праўленнем [7, с. 20].

На ўзроўні павета аўтары праекта абгрунтоўвалі неабходнасць стварэння пры павятовай радзе ячэек іншых гаспадарчых палат у выглядзе гаспадарчых камісій, таму вызначэнне «сельскагаспадарчая» ў назве магло і не выкарыстоўвацца. У іх склад павінны былі ўвайсці прадстаўнікі гмін (па адным ад кожнай), а таксама прадстаўнікі гмінных сельскагаспадарчых камісій і два дэлегаты ад добраахвотных арганізацый. Выканаўчым органам камісіі на гэтым узроўні і яе сакратаром павінен быць аграном. Ён арганізацыйна падпарадкоўваўся павятоваму аддзелу, а прафесійна – палаце. Для ажыццяўлення гэтых праектаў патрабавалася ўнясенне паправак у закон аб самакіраванні і распараджэнне прэзідэнта Польшчы аб сельскагаспадарчых палатах. На ваяводскім узроўні ў адносінах да гаспадарчага самакіравання прапаноўвалася падзяліць яго, а значыць

проста захаваць існуючы стан. Але найбольш значныя змены павінны былі адбыцца ў структуры сельскагаспадарчай палаты.

1. Неабходна было зменшыць колькасць прызначаных радцаў або ўвогуле скасаваць гэтую катэгорыю.

2. Рэкамендавалася дзейнасць сельскагаспадарчай палаты грунтаваць на працы не добраахвотных арганізацый, а павятовай гаспадарчай камісіі на чале з аграномам і гміннай сельскагаспадарчай камісіі на чале з інструктарам.

3. Пажадана было б даверыць нагляд за дзейнасцю сельскагаспадарчай палаты органам ніжэйшага ўзроўню і забяспечыць большую яе незалежнасць ад адміністрацыйнай улады. Дастаткова таго, што міністэрства сельскай гаспадаркі і сельскагаспадарчых рэформаў мела права роспуску сельскагаспадарчай палаты.

4. На агульнадзяржаўным узроўні прапаноўвалася аб'яднаць гаспадарчае самакіраванне ў адзінае цэлае ў форме павятовай гаспадарчай палаты [7, с. 21].

Адмова ад добраахвотных сельскагаспадарчых арганізацый як падставы дзейнасці сельскагаспадарчай палаты супярэчыла агульнадзяржаўным прынцыпам і выклікала негатыўную рэакцыю. Распачаўся адкрыты канфлікт паміж цэнтральным органам ЛНА і мясцовымі аддзяленнямі.

Такім чынам, Бюро даследаванняў ЛНА Віленскай і Навагрудскай акругі па сутнасці захоўвала асноўную канцэпцыю, распрацаваную ў рамках рэгіянальнага ББСУ, але патрабавала кардынальна змяніць арганізацыйную апору, што прывяло да складання праекта рэформы сельскагаспадарчага самакіравання. Калі аналізаваць вертыкальную структуру, прапанаваную ў праекце Віленска-Навагрудскай арганізацыі, то заўважым, што яна кардынальна парушае агульнадзяржаўную не толькі зменай базавай адзінкі (замест грамадскіх арганізацый ёй павінна была стаць гмінная сельскагаспадарчая камісія), але ў першую чаргу верхняй часткі пабудовы, якая фактычна стала падвоенай. Апошняе відавочна на ўзроўні павета, дзе створана гаспадарчая камісія на чале з аграномам, якая падпарадкоўваліся не толькі сельскагаспадарчай, але і гандлёва-прамысловай палаце. Аб'яднанне ўсіх рэгіянальных гаспадарчых сіл, прадстаўленых у палатах, і выпрацоўка адзінай праграмы для польскага грамадства і адміністрацыі – галоўны момант, цэнтралізуючы польскія сілы і сродкі.

У якасці базавай адзінкі ЛНА прапанавала гмінную сельскагаспадарчую камісію, якая разглядалася як ячэйка адпаведнай палаты ў тэрытарыяльным самакіраванні. Прапанавана было кардынальна змяніць яе склад. Замест дэлегатаў ад грамадскіх арганізацый у яе склад павінны былі ўвайсці па адным дэлегаце ад кожнай грамады, выбраным звыклай большасцю галасоў.

Фактычна рэгіянальная ЛНА захавала элітарны метад працы (з дэлегатамі ад грамады), але ён не перашкаджаў дабівацца масавага ўздзеяння, як таго патрабаваў урад. Першачарговы ўплыў аказваўся на дэлегатаў ад грамады, якія ў сваю чаргу «прамянявалі» на сваю тэрыторыю. Уцягванне сельскага насельніцтва ў працы гаспадарчага самакіравання вырашана было зрабіць за кошт яго прымусовага характару і апоры на тэрытарыяльнае самакіраванне.

Аб'ектам уздзеяння стала сельскагаспадарчая камісія гміннай рады, вакол якой планавалася аб'яднаць народныя масы з працамі сельскагаспадарчага самакіравання. Кансалідацыю польскага грамадства забяспечвала адзіная праграма і аб'яднаныя гаспадарчыя палаты, а каардынацыю – аграном. Усе ключавыя пазіцыі сканцэнтраваны ў руках палякаў.

**Заключэнне**

1. Арганізацыя грамадска-гаспадарчых з'ездаў, складанне па даручэнні ўрада і цэнтральных партыйных органаў праектаў сведчаць аб арганізацыйна-кіраўнічых функцыях партый у грамадска-палітычным жыцці. Яны выступаюць як суб'ект кіравання.

2. Праекты на рэгіянальным узроўні, нягледзячы на асаблівасці ў змесце працы, дэманструюць арганізацыйнае адзінства і пераемнасць паміж ББСУ і ЛНА. Партыі ўрадавай арыентацыі ў Віленскім і Навагрудскім ваяводствах у сваіх прапановах выразна сканцэнтраваліся на пытаннях рацыянальнай арганізацыі рэгіянальнай гаспадаркі, на змесце і якасці працы. Фактычна назіраецца імкненне выпрацаваць арганізацыйна-эканамічны метад уздзеяння на земляробаў.

3. Распрацавана канцэптуальная аснова паланізацыі. Першачарговымі былі вызначаны пытанні ўдасканалення сельскай гаспадаркі і пашырэння эфектыўнай апекі над сельскагаспадарчым вытворцам. На думку аўтараў праектаў, разам з распрацоўкай шляхоў павышэння дабрабыту будзе весціся і паланізацыя сельскага насельніцтва. Зварот сельскага гаспадара за апекай – вынік дзейнасці палат, адпраўная кропка паланізацыі, што павінна было прадвызначыць яе эфектыўнасць за кошт добраахвотнасці і свядомасці працэсу. Такім чынам, галоўны аб’ект уздзеяння – селянін.

4. Змест паланізацыйнага ўздзеяння ў разгледжаных дакументах не раскрываецца. Назва другога дакумента «Пробны нарыс…» паказвае, што ён знаходзіўся ў стадыі распрацоўкі. Затое праекты дэманструюць арганізацыйны, структурны бок паланізацыі. Рэгіянальныя аддзяленні партый урадавай арыентацыі на заходнебеларускіх землях займаліся распрацоўкай і ажыццяўленнем арганізацыйнага забеспячэння дамінавання польскай меншасці ў грамадска-гаспадарчым жыцці.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Zjazd działaczy gospodarczych i społecznych zwołany przez BBWR, Warszawa, 18.19 i 20.V 1933 r. – Warszawa : Nakładem BBWR, 1934. – 204 s.

2. Archiwum Akt Nowych (AAN). – Zesp. 105. Syg. 78.

3. Zjazd działaczy gospodarczych i społecznych miast województwa Poleskiego / BBWR. – Brzesc nad Bugiem : Nakładem Poleskiego wojewódskiego sekretariatu BBWR, 1934. – 60 s.

4. AAN. – Zesp. 323. K. 12.

5. Zjazd działaczy gospodarczych i społecznych miast województwa Wileńskiego zwołany przez radę wojewódzką BBWR w Wilnie 8 i IX 1933 r. / red. dr. A. Hirschberg i mgr. L. Pawłowski. – Wilno : Nakładem BBWR, 1933. – 170 s.

6. Государственный архив Брестской области. – Ф. 116. Оп. 1. Д. 22.

7. Projekt reformy samorządu rolniczego na ziemiach północno-wschodnich / Biuro Studiuw OZN okręgu Wileńskiego i Nowogródskiego. – Wilno : Znicz, 1937. – 24 s.

8. Januszewska-Jurkiewicz, J. Koncepcje programowe dziłaczy Obozu Zjednoczenia Narodowego Okręgu Wileńskiego i Nowogródskiego w kwestji białoruskiej / J. Januszewska-Jurkiewicz // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2005. – № 23. – S. 192–212.

9. AAN. – Zesp. 105. Syg. 83.

10. Żeligowski, L. O gospodarce samorządowej gromad i gmin powiatu wileńsko-trockiego : odbitka z Kurjera Wileńskiego z dn. 2.XII.1937 / L. Żeligowski. – Wilno : Znicz, 1937. – S. 1–3.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 06.10.2017

***Dzmitruk A.P.*** **Projects of Governmental Parties in the Area of Socio-Economic Work in Vilnius and Novogrudok Province 1928–1939**

*The party project of the government's orientation in the sphere of socio-economic work are important governmental sources that allow us to understand the objectives of the Polish government on the Belarusian lands, and to delineate the functions assigned to these organizations in the movement of Pilsudski, to prove the continuity in the activities of both political groups, to allocate established by the Polish authorities organizational legal construction of administration.*